РЭЦЭНЗАВАННЕ

Усе артыкулы, якія паступаюць у рэдакцыю, праходзяць двайное сляпое рэцэнзаванне.

Парадак рэцэнзавання

1. Навуковы артыкул, які паступіў у рэдакцыю, разглядаецца членамі рэдкалегіі на прадмет яго адпаведнасці профілю штогодніка і патрабаванням да афармлення. У выпадку адпаведнасці ўказаным крытэрыям артыкул накіроўваецца на рэцэнзаванне спецыялістам.

2. Рэцэнзаванне ажыццяўляецца членамі рэдакцыйнай калегіі выдання, якія маюць найбольш блізкую да тэмы артыкула навуковую спецыялізацыю. Рэдакцыя мае права прыцягваць знешніх рэцэнзентаў (доктараў або кандыдатаў навук). Да рэцэнзавання не прыцягваюцца спецыялісты, якія працуюць ва ўстанове, дзе выканана даследаванне.

3. Рэцэнзаванне праводзіцца канфідэнцыйна. Рэцэнзенты апавяшчаюцца аб тым, што прысланыя ім артыкулы з'яўляюцца прыватнай уласнасцю аўтараў і адносяцца да звестак, якія не падлягаюць разгалошванню. Рэцэнзенты, а таксама супрацоўнікі рэдакцыі не маюць права выкарыстоўваць веданне зместу працы ў сваіх інтарэсах да яе апублікавання. Рэцэнзентам не дазваляецца рабіць копіі артыкулаў для сваіх патрэб. Рэцэнзентам забараняецца перадаваць частку артыкула на рэцэнзаванне іншай асобе без дазволу рэдактараў. Парушэнне канфідэнцыйнасці магчыма толькі ў выпадку заявы аб недакладнасці або фальсіфікацыі матэрыялаў.

4. Тэрміны рэцэнзавання:

а) рэдкалегія разглядае прадстаўлены да публікацыі артыкул на працягу 10 працоўных дзён з моманту яго атрымання рэдакцыяй. Пасля гэтага аўтар атрымлівае апавяшчэнне аб рашэнні, прынятым у дачыненні да яго матэрыялу;

б) рэцэнзаванне артыкула ажыццяўляецца на працягу 30 працоўных дзён з моманту яго перадачы спецыялістам;

в) па ўзгадненні рэдакцыі і рэцэнзента рэцэнзаванне можа праводзіцца ў больш кароткія тэрміны.

5. Змест рэцэнзіі:

а) рэцэнзія павінна змяшчаць экспертную ацэнку артыкула па наступных параметрах: адпаведнасць артыкула профілю штогодніка; адпаведнасць зместу артыкула яго назве; навуковы ўзровень публікацыі; яснасць і лагічнасць выкладу матэрыялу; ступень прадстаўленасці ў артыкуле сучасных дадзеных па даследуемай праблеме; адпаведнасць публікацыі патрабаванням выдання (аб'ём, стыль выкладу, структура, афармленне ілюстрацыйнага матэрыялу і спасылачнага апарату);

б) рэцэнзент мае права даць рэкамендацыі аўтару і рэдакцыі па дапрацоўцы артыкула. Заўвагі і пажаданні рэцэнзента павінны быць аб'ектыўнымі і прынцыповымі, накіраванымі на павышэнне навуковага і метадычнага ўзроўня артыкула;

в) у заключнай частцы рэцэнзіі павінна змяшчацца адно з наступных рашэнняў:

– рэкамендаваць прыняць артыкул да публікацыі;

– рэкамендаваць прыняць артыкул да публікацыі з унясеннем нязначных (тэхнічных) выпраўленняў;

– рэкамендаваць прыняць артыкул да публікацыі ў скарочаным выглядзе;

– рэкамендаваць прыняць артыкул да публікацыі пасля істотнай перапрацоўкі;

– рэкамендаваць адмовіць у публікацыі артыкула.

6. У выпадку прыняцця рэцэнзентам рашэння аб паўторным рэцэнзаванні аўтар павінен унесці ўсе неабходныя выпраўленні і прадставіць рэдакцыі канчатковы варыянт з суправаджальным лістом – адказам рэцэнзенту. У гэтым выпадку датай паступлення ў рэдакцыю лічыцца дата вяртання дапрацаванага артыкула. У выпадку, калі пры паўторным рэцэнзаванні рэцэнзент прымае аналагічнае рашэнне (немагчымасць прыняцця артыкула без дапрацоўкі), працэдура паўтараецца.

7. У выпадку адмоўнай ацэнкі артыкула рэцэнзент павінен пераканаўча абгрунтаваць свае высновы.

8. Аўтар атрымлівае апавяшчэнне аб прынятым рашэнні. Рэдакцыя выдання абавязкова накіроўвае аўтару рэцэнзію на артыкул у электронным выглядзе без подпісу і ўказання прозвішча, пасады, месца працы рэцэнзента. У выпадку адмовы ад публікацыі артыкула аўтару накіроўваюць рэцэнзію і матываваную адмову.

9. Пасля рэцэнзавання артыкулы, прынятыя да публікацыі, праходзяць літаратурнае рэдагаванне і вёрстку. PDF-файл артыкула накіроўваецца кантактнаму аўтару для ўзгаднення. На працягу 2–3 дзён аўтар павінен узгадніць артыкул з рэдакцыяй.

10. Рэдакцыя выдання не захоўвае рукапісы, не прынятыя да друку.

11. Рукапісы, прынятыя да публікацыі, не вяртаюцца. Рукапісы, якія атрымалі адмоўную ацэнку ад рэцэнзента, не публікуюцца і таксама не вяртаюцца аўтару.

12. Рэцэнзіі захоўваюцца ў рэдакцыі.

13. Рэдакцыя мае права часткова або цалкам прадастаўляць матэрыялы навуковых артыкулаў у замежныя арганізацыі, якія забяспечваюць індэксацыю навуковых публікацый, а таксама размяшчаць дадзеныя матэрыялы на сайце выдання.

14. Чарговасць публікацыі артыкулаў устанаўліваецца па даце прыняцця рукапісу.